Мікола Захаранка



...Тройчы зіхатнула неба,
і хлопцаў стала трое...

# Забойства на вуліцы з прысадамі

***Любоўна- крымінальная фантасмагорыя...***

Вулка была пабудаваная яшчэ за царом Гарохам. Вулка — гэта ня хаты з прыбудовамі, не агароджы перад гэтымі хатамі, нават не шчарбаты брук на ёй. Не, яна была сама па сабе: вулка дый вулка! Гэта была адметная зьява чалавечай культуры, бо стваралася не чалавечым розумам, не людскімі рукамі і не сьвядомай людскою працаю. Рабілася Вулка чалавечымі нагамі. Зрэшты, наконт сьвядомасьці — пытаньне спрэчнае: па якой патрэбе — разумнай ці дурной — ішоў чалавек, Вулцы было «да ліхтара». Галоўнае — ён ішоў, а яна расла: шырылася і доўжылася! Вандроўкі людзей туды-сюды былі Вулцы да ліхтара і ў літаральным сэнсе, бо ў рэшце-рэшт яна з Вулкі зрабілася Вуліцай, і пасярод яе людзі паставілі той самы Ліхтар.

Аднойчы ліпеньскай ноччу на гэтай Вуліцы, пад гэтым самым Ліхтаром адбылося страшнае здарэньне.

Сьведак было двое: Вуліца і Ліхтар. Калі б аб'яднаць іхнія назіраньні ў адно, магло б атрымацца трохмернае сьведчаньне злачынства: Вуліца ляжала на плоскасьці — Ліхтар вісеў на слупе, перпендыкулярна гэтай плоскасьці.

Але хто аб'яднае? На той час у хатах за прысадамі ўсе людзі спалі. Таму ў мястэчковых паданьнях цьвёрда заснавалася адзіна трывалая версія здарэньня: забойца быў моцны і жорсткі, ахвяра — безабаронная і пяшчотная.

А было не зусім так. Нават — зусім ня так.

Па Вуліцы ішлі двое. Цьвёрды поступ крокаў даваў ёй знаць, што крочыць мужчына, а лёгкая драбнейшая хада выдавала на жаноцкую. Ліхтару, з вышыні ягонага слупа, шырэйшыя клубы і вузейшыя плечы аднаго з ценяў таксама не далі памыліцца. Ён упэўнена адрозьніў дзявочую постаць ад хлапечай. Ці жаночую ад мужчынскай? Апошняй дэталі Ліхтар не давёў бы і пад прысягай — ноч жа! Таму і мы ў далейшым будзем блытаць гэтую маласутнасную дробязь.

Двое спыніліся пад Ліхтаром.

«Чаму? — здзівілася Вуліца. — Звычайна двое хаваюцца ў цяньку каля прысадаў...»

— Вось ты і прывяла мяне сюды, — з адчаем прамовіў мужчынскі (альбо хлапечы) голас.

— Не, гэта ты прывёў, — запярэчыла жанчына.

— Але навошта?

— Ня ведаю. Звычайна ты вадзіў мяне па цёмных кутках, каб цалавацца ўпотай ад людзей.

Ліхтар са згодай паківаў галавой, Вуліца ўсьміхнулася.

— Сёньня ў маёй душы стаіць цемра! Нават сьвятло гэтага цьмянага ліхтара вабіць болей, чым твае вусны, — паскардзіўся мужчына.

Ліхтар адчуў лёгкі ўкол абразы і зазьзяў ярчэй.

— Прабач, — мужчына дапытліва зазірнуў у вочы жанчыне. — Табе кепска?

— Ніколечкі! Але твая горыч псуе мне настрой.

— Калі б я мог радавацца, я быў бы рады і такому твайму адказу.

— Што ў ім радаснага? — хмыкнула жанчына.

— Усё ж, хоць якая спагада.

«Звычайны закаханы зануда», — падумала Вуліца.

Але яна памылялася.

— Спагада! — сказала жанчына з сарказмам. — Ты ня здольны спагадаць майму шчасьцю, вось табе і горка.

— Ты хацела сказаць «нашаму шчасьцю», — паправіў ён. — Але сёньня я не адчуваю яго, можа таму і шчыміць маё сэрца?

— Не таму... — загадкава адказала жанчына.

— Дык чаму ж! — усклікнуў хлопец.

— Ну, ведаеш... Навальніца... Неспрыяльныя метэаралагічныя ўмовы... Рознае.

Ліхтар пакруціў галавою, агледзеўся навокал і ўбачыў чорнае, чарнейшае за астатняе неба, груганова крыло навальнічнай хмары з паўночнага канца Вуліцы.

— Калі ты вось гэтак жартуеш, я, здаецца, мог бы забіць цябе, — раздражнёна адказаў мужчына.

— Забі, — сказала жанчына. — Маеш права.

— Ты трызьніш, гэта не на мяне, гэта на цябе цісьне навальніца.

— Ды не, я ў цьвярозай памяці... Амаль у цьвярозай, — яна зноў загадкава ўсьміхнулася. — І ведаеш... твая праўда: мае ногі прывялі нас да гэтага... ганебнага слупа.

Слуп не здрыгануўся, наогул ніяк не адрэагаваў, бо з таго часу, як яго прамачылі ў сьмярдзючым смаляным растворы, зрабіўся не адчувальным да зьнявагі, што, дарэчы, нахабна скарыстоўвалі ўсе мястэчковыя сабакі, беспакарана задзіраючы на яго нагу.

— Кажы далей. Ты, безумоўна, трызьніш, але мне цікава, — голас хлопца задрыжэў.

— Здраднікаў і злачынцаў заўсёды прыводзяць да ганебнага слупа пад прымусам, але... я прыйшла сама.

— Ага! Пакаянны подзьвіг, — уключыўся ў гульню хлопец, відаць спадзяючыся, што яна не звар'яцела, а проста жартуе. — А каму ты здрадзіла?

— Табе.

— Ха-ха! І ты вырашыла прызнацца каля гэтага слупа! Ён сапраўды ганебны, пад яго бегаюць сабакі, — усё яшчэ жартаваў хлопец. Але Вуліца адчула паколваньне ад падэшваў жартаўніка.

«Токі лёгкага жаху», — вызначыла спрактыкаваная Вуліца. Ад чалавечых ног заўсёды зыходзяць розныя токі: жаху, радасьці, пажадлівасьці, жалобы, помсты, злачынства — у залежнасьці ад таго, які чалавек крочыць па Вуліцы. Пасьля хаўтурных працэсіяў ці, як нядаўна, пры камуністах, пасьля раённых партыйных зьездаў у Вуліцы доўга балелі бакі і сярэдзіна ад атрыманай высокай дозы адмоўных токаў.

Ліхтар ніякіх хлопцавых токаў не адчуваў і, наогул, паколькі быў закаранелы бабнік, ня зводзіў вачэй з дзяўчыны. Або жанчыны. Яму вельмі спадабалася, як грацыёзна пацiснула яна плячыма.

— Адкуль я ведаю, чаму менавіта тут мне закарцела прызнацца?

— У чым? Не кажы загадкамі! – хлопец, мабыць, канчаткова вычарпаў свой штучны гумар і цярпеньне.

«Слабак, нервы — нікуды. З жанчынамі трэба ня так», — з пачуцьцём перавагі зазначыў Ліхтар.

— Я болей не кахаю цябе, — сказала дзяўчына. Ліхтар і Вуліца перасталі дыхаць. Яны ведалі, чым заканчваюцца падобныя дыялогі...

«Зараз ён лясьне ёй па пысе», — вульгарна, па-вулічнаму падумала Вуліца.

Ліхтар зладзейскім праменьчыкам высьветліў чорны вар'яцкі позірк мужчыны альбо хлопца і сьветлыя, гожыя, але нейкія пустыя вочы дзяўчыны.

Нечакана Вуліца пачала рытмічна ўздрыгваць, а Ліхтар загайдаўся. Прычына была ў рэзанансе: грукат коньніцы Вітаўта, што аднойчы пранеслася тут, калі Вуліца была яшчэ цёмнай лагчынай паміж дзікіх лясоў, ня быў мацнейшы за грукат хлапечага сэрца! Хлопец пахіснуўся і схапіўся за грудзі.

«Арытмія і тахікардыя!» — канстантавала Вуліца.

«Інфаркт з міякардам!» — аўтарытэтна запярэчыў Ліхтар.

Ліхтар і Вуліца былі дылетантамі ў медыцыне, проста наслухаліся тэрмінаў ад наведвальнікаў аптэкі, пабудаванай яшчэ пры царызме на Вуліцы якраз насупраць Ліхтара.

Але калі б яны і былі прафесійныя медыкі, усё роўна памыліліся б: тут не патыхала будзённасьцю і карвалолам.

— У тваёй волі адпусьціць мяне альбо забіць, — ледзь чутна прамовіла дзяўчына, апусьціўшы галаву.

Па цёмным небе прагуляўся далёкі гром, потым настала задушлівая цішыня і моцна запахла метыёламі.

— Ха-ха-ха! — раптам зайшоўся хлопец, нялюдскім жахлівым рогатам.

Чаму пры гэтым не прачнуліся людзі з хатаў за прысадамі — адна са шматлікіх таямніцаў нашага аповеду.

— Ха-ха-ха! — не змаўкаў хлопец. — Гы-гы-га!

Ліхтар з прычыны сваёй электрафізічнай прыроды ўмеў чытаць нямыя чалавечыя думкі з адлегласьці 40-45 метраў. Таму праз заслону акустычнага «ха-ха-ха» ён прачытаў нячутнае:

«Ага! Гэта новы ветэрынар Вацлаў з Дзятлава! Даўганосы дэбіл. Кабылячы доктар! Дык вось чаму яна!..»

— Ха-ха-ха! — неслася ўздоўж Вуліцы.

«Істэрык!» — грэбліва падумала Вуліца, якая чула толькі тое, што чула, і думак чытаць ня ўмела.

«Вось табе і «ха-ха-ха» — са зьдзіўленьнем і нечаканай спагадай да хлопца падумаў Ліхтар. — О-хо-хо! Жыцьцё пражыць — ня поле перайсьці!» — Ён назіркам ведаў гэтага «кабылячага доктара з Дзятлава» і на ўсю моц вылупіўшы сваё адзінае вока, дзівіўся з любоўнага выбару дзяўчыны, ды і наогул з таямніцаў жаночай душы. Узяць тую ж Вуліцу: прамая, як струна, а колькі ў яе таемных куточкаў, куды ніякім промнем не зазірнеш...

— Цішэй, даражэнькі, людзі пачуюць, — супакойвала, тузала, угаворвала дзяўчына.

— Людзі! Ды іх і громам не разбудзіш! Ім заўтра на працу ісьці! — злосна і весела крычаў хлопец.

Шматвопытныя Вуліца і Ліхтар мусілі з гэтым моўчкі пагадзіцца.

— Няма маёй волі на цябе, мая любая, — сказаў нарэшце паспакайнелы хлопец.

— І ты ня будзеш помсьціць? — Ліхтар са зьдзіўленьнем пачуў у голасе дзяўчыны нотку расчараваньня. Вуліца чамусьці не зьдзівілася.

— Я – не.

— Але хто, калі ня ты?

— Ня ведаю.

«Банальная драма, — пазяхнула Вуліца, рыхтуючыся падрамаць перад гаманлівым ранкам. — Хоць бы па пысе разок ляснуў!»

Але тут ляснуў пярун такой моцы, якой не было чуваць і пры паганскім часе. Над Ліхтаром павісла шаравая маланка, ад бляску якой на момант асьлеп і сам Ліхтар.

Вось тут і пачала дзеяцца ўласна фантасмагорыя.

Сучасныя вучоныя-матэрыялісты маюць рацыю, адмаўляючы містыку. Яны, відаць, інстынктыўна разумеюць, што містыка — ад Бога і абачліва ня лезуць у чужы агарод. Іншая справа — рознага кшталту фантасмагорыі або, прабачце, анамальныя зьявы. Гэта, несумненна, д’яблавых рук справа, яна не такая неспасьціжная, як містыка. А як на добрае навуковае вока, дык, нават, і цалкам спасьцігальная. Няхай сабе, некалі, у далёкім-далёкім будучым, але ўсё-ткі! Каму не вядомы тэзіс пра пазнавальнасьць Сьвету?

Праўда, тут ёсьць свае хітрасьці. Кожны вучоны дасьледчык сярэдняй рукі ведае: калі фантасмагорыю вывучаць цалкам і адразу, дык у лепшым выпадку можна зрабіцца заікам. Але на нашае шчасьце, фантасмагорыя, у адрозьненьне ад містыкі, паддаецца аналізу! Інакш кажучы, патроху, пакрысе дзеліцца на часткі і па частках жа вывучаецца.

Такім чынам, што ж здарылася потым на Вуліцы каля слупа, на якім вісеў Ліхтар?

Давайце разважым, як вучоны дасьледчык.

Найперш трэба дапусьціць прысутнасьць там бія-электра-паталагічнага феномену, які, галаву даю на адсячэньне, там прысутнічаў! Бяз гэтага дапушчэньня шанц зрабіцца заікам узрасьце, як той казаў, ад нуля да бясконцасьці. Кажучы па-простаму, паталагічная электрычнасьць так падзейнічала на біялогію закаханага хлапца, што далейшыя падзеі былі проста фенаменальнымі! Проста фантасмагорыя нейкая.

Хлопец ашчаперыў дзяўчыну і прыціснуў яе да слупа.

— Пусьці, памнеш сукенку! — непрыязна сказала дзяўчына.

Гэтая фраза і накопленая непрыязь паслужылі паролем нячыстай сіле. Двойчы бліснула маланка, і хлопец раздвоіўся ў вачах Ліхтара і Вуліцы. І, відаць, у вачах дзяўчыны, бо яна сказала.

— Пусьціце, калі ласка, вы памнеце сукенку! Тройчы зіхатнула неба, і хлопцаў стала трое.

— Ня мніце маю новую сукенку, вы робіце мне балюча! — Дзіўна: у яе голасе чулася абурэньне і жаночы адчай, але не было жаху.

— Твой боль нішто ў параўнаньні з маім, — сказалі трое голасам, моцна скажоным электрастатычным полем.

— Вас трое, вы ня маеце права! — прастагнала дзяўчына голасам ахвяры, якую гвалтуюць менавіта трое.

«Яшчэ і цацу з сябе строіць, вашчылка. Падумаеш — трое!» – павулічнаму пахабна ў думках пажартавала Вуліца, лагодна ўспамінаючы сваю маладосьць перыяду антыфеадальнага паўстаньня Васіля Вашчылы.

— Я адзін, — адказалі трое. — Але я не памяшчаюся ў адным целе, ты не зважай.

— А я і не зважаю, — з выклікам сказала дзяўчына.

— Я кахаю цябе, — выдыхнуў адзін.

— Я ненавіджу цябе, — скрыгатнуў зубамі другі.

— Я не хачу жыць, — з адчаем сказаў трэці.

— Ты парваў маю сукенку! — дзяўчына ўпарта, з усяе сілы не хацела заўважаць нічога жудаснага навокал.

— Не журыся, табе зробяць новую! — данеслася аднекуль зьверху.

Ліхтар задраў галаву, каб убачыць, хто гэта сказаў, але нікога сярод нізкай хмарнай каламуці ня ўгледзела ягонае жоўтае вока.

— Я не хачу новую, — нарэшце здалася, заплакала дзяўчына. — Я хачу жыць.

— О, калі б гэта было магчыма, любая! — заплакаў і каханак.

— Ты ня маеш права жыць! — крыкнуў ёй у твар ненавісьнік.

— Ты хочаш жыць, як гэта горка! — усклікнуў адчайнік.

— Ну, што ж, рабі сваю справу, кат, — прасьветлена ўсьміхнулася дзяўчына скрозь слёзы. — Твая воля.

— О, не! Не мая! Воля Неба, воля апраметнай, воля лёсу! Не мая, не мая, не мая, — наперабой загаласілі трое.

Зноў тройчы бліснула маланка, грымнуў гром і лінуў дождж.

— Бывай, мая любая, — сказаў каханак, сьпяшаючыся. — Бывай, мой любы вораг, — сказаў ненавісьнік і скрывіўся ад болю.

— Пойдзем са мной, маё каханьне, — умольна сказаў адчайнік.

І яны прыпалі вуснамі да яе вуснаў. На мокры пясок каля слупа ўперамешку з дажджавымі струменямі пацякла кроў. Ліхтар падазрона прыгледзеўся. Цяпер ён ня мог бы прысягнуць, што гэта была кроў аднае толькі дзяўчыны. Бо мела яна два адценьні: сьвятлейшае і цямнейшае – і гэта Ліхтар, як прыроджаны дальтонік, мог пацьвердзіць пэўна.

Вуліца не заўважыла такой акалічнасьці — яна была захопленая суперажываньнем.

«Праклятыя вампіры, угамону на вас няма! — сярдзіта абуралася Вуліца. І згодна законам жалезнай жаночай логікі, вывела: «Усе мужчыны крывасмокі. Узяць таго ж Ліхтара: назола, якіх ня знойдзеш, халера ясна!».

«Звычайныя сексуальныя маньякі», — легкадумна вырашыў Ліхтар. Яны зноў памыляліся. Нічым такім банальна-крымінальным тут і ня пахла. Праз момант яны ўпэўніліся ў гэтым самі.

Нейкі новы электрамагнетычны феномен так паталагічна гахнуў па макушцы слупа, што Ліхтару зрабілася моташна. Тры фантомы раптам зноў зьліліся ў адно першапачаткювае цела, а тое, у сваю чаргу, пачало дзяліцца на пругкія цвёрдыя валокны, якія на вачах ператвараліся ў звычайны металічны дрот. Паволі, спакваля, няўмольна і няўхільна, як сказаў бы паэт, дрот абвіваў дзяўчыну, прыкручваў яе да слупа і прарастаў калючкамі.

«Як у фільме жахаў!» — захоплена падумаў Ліхтар, які меў таемную загану крадком зазіраць у вокны дамоў за прысадамі ў самы інтымны час, калі людзі нанач глядзяць фільмы жахаў.

Вуліца так уразілася, што ажно брук на ёй стаў на дыбкі. «Куды ён падзеўся? Ні рук, ні тулава, ні галавы, ні ног! Няўжо гэты жмутак калючага дроту вырабіўся з цела закаханага вар'ята? Такога яна не бачыла ні з часоў Усяслава Чарадзея, ні з часоў Льва Сапегі, ні з часоў Уніі, контррэфармацыі, трох падзелаў Рэчы Паспалітай, Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі, Булак-Булаховіча, раскулачваньня, хрушчоўскай адлігі, застою, перабудовы — наогул ніколі ня бачыла. Хадзілі чуткі пра нешта такое, але каб на свае вочы!

Між тым драцяны клубок каханьня, нянавісьці і адчаю рабіўся ўсё — тужэйшым. Спавітая ім і сколатая наскрозь дзяўчына ўжо не магла паварухнуцца, пакута на яе твары таксама зьнерухомела. Перападала і слупу.

Токі каханьня шалёна віравалі ў кожным драцяным вітку і наводзілі такую эратычную індукцыю, што слуп ужо быў намерыўся выпусьціць ружы, але не пасілеў.

Ад нянавісьці, якую ўпырсквала ў яго кожнае джала гэтай «нямецкай калючкі», слуп гатовы быў спарахнець. Але як? Калісьці яго прамачылі ў сьмярдзючым смаляным растворы...

Ад сьмяротна-безнадзейнага драцянога шоргату слуп усёй душой жадаў бы засохнуць, але ён і так быў сухі.

«Ё раўно эмцэ квадрат!» — асуджана мацюкаўся слуп сабе пад нос. Паколькі ён быў ня просты слуп з агароджы, а электрычны — ён і мацюкаўся адмыслова...

Ліхтар наверсе дэкламаваў:

«Слуп, ён на тое і слуп, каб навечна застацца слупом! Няблага. Нагадвае Кіплінга», — ганарліва цешыўся Ліхтар у прыпадку шызаграфаманіі.

У яго быў непарадак з галавой.

У тую страшную ноч паднябесныя навальнічныя электрачары пасвойму закранулі кожнага. І толькі дзяўчына адпрэчыла начны жах звышнатуральных хлапечых каханьня, нянавісьці і адчаю. Яна сканала моўчкі, з заплюшчанымі вачыма і пакутна-грэблівым выразам на твары. Яна сапраўды не кахала яго.

Аднак... Гэта ж трэба было так не кахаць! Міжволі прамільгне ідыёцкая думка: а хто каго, уласна кажучы, тут забіў?

Раніцай людзі з хатаў за прысадамі ўбачылі толькі вынік тых падзеяў, якія з самага пачатку назіралі Вуліца і Ліхтар. І, як заўжды бывае той, хто прыходзіць на шапачны разбор — выглядае дурнейшым за ўсіх. Гэтак і людзі. Яны навыперадкі паўтаралі менавіта памылковыя начныя меркаваньні Вуліцы і Ліхтара. У дадатак напрыдумвалі сваіх.

Некаму ўбачанае нагадала любімы фільм жахаў; нехта глыбока задумаўся пра загадкавую і тонкую псіхалогію маньякаў; у некага абвастрылася вампірафобія; ветэрынару Вацлаву з Дзятлава ад выгляду крыві зрабілася блага, і яму давалі нюхаць нашатыр і адпойвалі валяр'янкай, (прычым ён патрабаваў сабе менавіта «конскую» дозу, як сьпецыялісту адпаведнай прафесіі); заезны менскі скульптар-постмадэрніст натхніўся на манументальны твор пад назвай «Лаакаонша Міле్ніюму»; больш прыземленыя істоты спрачаліся наконт «лятальнага канца грамадзянкі Алены Чарвяковіч» (ейны пашпарт знайшлі падлеткі ў касьметычцы).

Але ўсе пагадзіліся на адным: першае — адбылося забойства з ужыткам нетрадыцыйных метадаў; другое — забойца ўцёк; трэцяе — паскуду трэба знайсьці і прыдушыць.

Ды, як нам вядома, гэтыя людскія меркаваньні з пажаданьнямі — ёсьць суцэльная і поўная лухта, што і будзе доказана з часам.

Псіхічна прыгнечаныя Вуліца і Ліхтар нема дзівіліся з людскоe дурноты.

Адзіна цьвярозае, што зрабілі людзі, дык гэта тое, што пасьля медэксьпертызы прызналі Алену Чарвяковіч мёртвым целам і пахавалі яе на каталіцкіх могілках. Дротам жа, па рашэньні ксяндза і гарвыканкаму, адгарадзілі той кавалак могілак, на якім традыцыйна хаваюць самазабойцаў.

Тут людзі, мусіць, таксама мелі рацыю.

А можа і не.

*31 сьнежня 2000 г.*